Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 СТУДЗЕНЯ 2007 г. ЧАЦВЕР

№ 16 (25881)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Стыхія



Фота Пятра ФАМІНА.

## ВАДЗІЦЕЛЯЎ НА БЕЛАРУСКІХ ДАРОГАХ ЧАКАЮЦЬ ЧАРГОВЫЯ ВЫПРАБАВАННІ

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, 25 студзеня на большай частцы тэрыторыі Беларусі будзе ісці снег, месцамі моцны, мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Парывы ветру могуць дасягаць да 18 метраў у секунду. У сувязі з рэзкім пагаршэннем надвор'я ДАІ рэкамендуе пачынаючым вадзіцелям, якія не маюць вопыту кіравання транспартным сродкам у зімовых умовах, устрымацца ад паездак. А тым, хто ўсё ж выедзе ў непагадзь, варта праявіць максімум увагі і асцярожнасці: не рабіць рызыкоўных манеўраў, захоўваць дыстанцыю і бакавы інтэрвал, знізіць хуткасць на слізкай дарозе.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## БЕЛАРУСЬ І В'ЕТНАМ ДАСЯГНУЛІ ЎЗРОЎНЮ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Нгуен Мінь Чыета з 15-й гадавінай устанаўлення дыпламатычных адносінаў паміж Беларуссю і В'етнамам.

«Нашы дзяржавы маюць падобныя пазіцыі і канструктыўна ўзаемадзейнічаюць па ключавых знешнепалітычных праблемах, выступаюць супраць стварэння аднапалярнага свету, за захоўванне інтарэсаў краін, якія сталі на шлях развіцця, і краін з пераходнай эканомікай», — падкрэсліў у пасланні Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ВЫГАДА РАСІІ АД НАФТАГАЗАВАГА КАНФЛІКТУ З БЕЛАРУССЮ МІЗЭРНАЯ — МЕРКАВАННЕ РАСІЙСКАГА ПАЛІТОЛАГА

**Атрыманая Расіяй выгада ад нядаўняга нафтагазавага канфлікту з Беларуссю ў $1 млрд мізэрная не толькі па сусветных мерках — яна нязначная і для расійскага бюджэту. Такую думку ўчора на прэс-канферэнцыі ў Маскве выказаў расійскі палітолаг, кіраўнік Інстытута праблем глабалізацыі Міхаіл Дзялягін.**

«Нафтагазавым канфліктам мы смяротна напалохалі Захад. Акрамя таго, мы моцна пакрыўдзілі Беларусь: з братамі не ваююць», — сказаў ён.

На думку палітолага, за нафтагазавым канфліктам з Беларуссю стаяць пэўныя бізнэс-колы. «Людзям, кола якіх абмежавана сваім кашальком, саюзнікі не патрэбны. Для іх сябры, браты, саюзнікі — гэта чыстая страта», — падкрэсліў Міхаіл Дзялягін.

Рашэнне аб павышэнні цаны на газ для Беларусі, лічыць ён, накіравана на разбурэнне беларускай эканомікі і беларускага грамадства. У той жа час, падкрэсліў Міхаіл Дзялягін, Захад уважліва глядзіць на развіццё беларуска-расійскіх адносінаў. «На Захадзе наспявае стратэгічны праект — ператварыць Беларусь у маленькую еўрапейскую Расію, якая будзе аб'ектам зайздрасці для бядненькіх слаёў расіян», — лічыць расійскі палітолаг.

**Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.**

## «МЫ — ПАРТНЁРЫ НАДЗЕЙНЫЯ»

**Гэтымі словамі падвёў вынікі сустрэчы з кіраўніцтвам Міжнароднай кампаніі «Apollo-Rida Polland», якая адбылася 24 студзеня ў Мінскім аблвыканкаме, яго старшыня М.Ф. Дамашкевіч.**

Гэтая кампанія спецыялізуецца на нерухомасці і валодае значнымі плошчамі розных універсальных збудаванняў у такіх краінах, як Польшча, Германія, Расія, Украіна і некаторых іншых. Яна мае рэпутацыю надзейнага партнёра ў сферы сваёй дзейнасці, яе партнёрамі з'яўляюцца многія іншыя буйныя кампаніі, шматнацыянальныя карпарацыі, фінансавыя інстытуты і ўрадавыя арганізацыі шэрагу краін.

На сустрэчы прэзідэнт кампаніі «Apollo-Rida Polland» Мітцнер Дэвід сказаў: «Мы вельмі зацікаўленыя ў магчымым супрацоўніцтве з Мінскай вобласцю ў сферы інвеставання будаўніцтва супермаркетаў і іншых аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ў рэгіёне і маем магчымасць рабіць гэта па ўсёй вашай рэспубліцы. Сталічная вобласць вельмі прыцягальная для інвестараў, і мы, ведаючы пра вас як пра надзейнага партнёра, не баімся ісці сюды са сваім капіталам. Пры ўмове дасягнення ўзгодненых пазіцый мы гатовыя за 3 гады стварыць тут сучасную развітую структуру прыдарожнага сэрвісу і забяспечыць занятасць 3—4 тысячам беларускіх грамадзян».

Старшыня аблвыканкама М.Ф. Дамашкевіч адзначыў, што гэтая сустрэча і выказаныя ў ходзе перамоў прапановы з'яўляюцца практычным крокам да рэалізацыі патрабаванняў кіраўніка дзяржавы А.Р. Лукашэнкі па прыцягненню ў эканоміку і сацыяльную сферу Беларусі дадатковых інвестыцыйных сродкаў, што будзе садзейнічаць больш якаснаму забеспячэнню дзяржаўных сацыяльных стандартаў.

У ходзе перамоў бакі абмеркавалі папярэднія ўмовы рэалізацыі сумеснага праекта і вызначылі план сваіх дзеянняў на бліжэйшую перспектыву.

**Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы аблвыканкама.**

## «ЗАРЫ НАД СОЖАМ» — 75!

Столькі споўнілася 25 студзеня кармянскай раённай газеце, якая заўсёды (робіць гэта і зараз) асвятляла шматграннае жыццё рэспублікі, вобласці і, вядома ж, свайго раёна. Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, неаднаразова выходзіла пераможцам розных рэспубліканскіх конкурсаў...

Юбілей газеты супаў з такой датай: споўнілася 40 гадоў, як у калектыў прыйшоў на працу малады супрацоўнік Анатоль Ушаў, і зараз гэты адзін са старэйшых журналістаў Гомельшчыны з'яўляецца галоўным рэдактарам газеты. Віншуем «Зару над Сожам» і жадаем яе калектыву моцнага здароўя і новых поспехаў!

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ТАКСІ ПРАНУМАРУЮЦЬ

**Беларускія таксісты неўзабаве атрымаюць асабістыя нумарныя знакі для сваіх аўтамабіляў.**

Як паведаміў падчас прэс-канферэнцыі міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, аўтамабілі таксі будуць мець нумары жоўтага колеру. Ужо аб'яўлены тэндар на іх вытворчасць. Паводле слоў кіраўніка МУС, увядзенне нумарных знакаў для таксі паспрыяе больш эфектыўнай барацьбе з незаконнымі перавозкамі пасажыраў.

Міністр таксама адзначыў, што для выяўлення «таксістаў-нелегалаў» у кожным падраздзяленні дарожна-патрульнай службы ДАІ дзейнічае тэлефон «гарачай лініі».

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Твае правы

# КВАТЭРА. У «РАБОЧЫМ» ВАРЫЯНЦЕ

**Кожная поўная сям'я, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можа адначасова знаходзіцца адразу ў трох чэргах — па месцы жыхарства, а таксама па месцах работы мужа і жонкі. Між тым, якраз наконт апошніх варыянтаў вырашэння вядомага «жыллёвага пытання» раз-пораз і ўзнікаюць няпростыя пытанні. У прыватнасці, каго і на якіх умовах прымаюць на ўлік на рабоце, якую ролю адыгрывае тут «фактар прапіскі», як часта неабходна аднаўляць пакет неабходных дакументаў, і, уласна кажучы, ці магчыма ў такой сітуацыі прэтэндаваць на дапамогу дзяржавы або «свайго» прадпрыемства? З усім гэтым і іншым мы паспрабуем разабрацца з дапамогай намесніка загадчыка юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарата Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Васіля Мікалаевіча КОРСУКА.**

### Метраж. Але не толькі

Першая і ці не галоўная ўмова для пастаноўкі на ўлік як па месцы жыхарства, так і па месцы працы — наяўнасць менш чым 15 квадратных метраў агульнай плошчы на кожнага члена сям'і. Разам з тым гэта ўмова не адзіная. Як зазначае Васіль Корсук, Палажэнне аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, што зацверджана ўказам кіраўніка дзяржавы ад 29 лістапада 2005 года, вызначае даволі вялікі пералік падстаў, паводле якіх прыняць на ўлік могуць і незалежна ад метражу. Такім чынам, спынімся на некаторых, найбольш распаўсюджаных сітуацыях.

Так, па-першае, не зважаючы на колькасць квадратных метраў, прымаюцца на ўлік грамадзяне, якія пражываюць у жылых памяшканнях, што прызнаныя неадпаведнымі санітарным і тэхнічным патрабаванням. Па-другое, жыхары інтэрнатаў — за выключэннем выпадкаў пражывання ў сувязі з навучаннем, сезоннымі ці часовымі работамі. Па-трэцяе, асобы, што пражываюць у памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду па дагаворах паднайму, або ў памяшканнях прыватнага фонду — па дагаворах найму. Па-чацвёртае, на пастаноўку на ўлік могуць разлічваць работнікі, што пражываюць у службовых дамах ці кватэрах. Па-пятае, грамадзяне, якія пражываюць у аднапакаёўцы ці ў адным пакоі з іншымі асобамі, што, згодна са спецыяльным пералікам Міністэрства аховы здароўя, маюць небяспечныя для навакольных захворванні. Па-шостае, грамадзяне, якія пражываюць у адной кватэры ці аднакватэрным жылым доме, якія заселены некалькімі ўласнікамі, або, кажучы інакш, у «кватэрах з агульнай кухняй».

Па-сёмае, гаворка ідзе аб грамадзянах, што пражываюць у кватэрах з неізаляванымі сумежнымі пакоямі пры адсутнасці блізкага сваяцтва. Па-восьмае, аб асобах, што ўзялі першы шлюб, — пры ўмове, што ні муж, ні жонка не маюць асобнай кватэры. Наступная падстава — нараджэнне ці ўсынаўленне дзіцяці без уступлення ў шлюб пры адсутнасці зноў-такі асобнай кватэры. Далей. Без уліку метражу ў чаргу прымаюцца спецыялісты, якія прыбылі на працу па размеркаванню навучальных устаноў або па накіраванню дзяржаўных органаў у зоны з радыяцыйным забруджваннем з узроўнем больш за 5 Кюры. Нарэшце, не бяруцца пад увагу метры ў адносінах да дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, якія не маюць ва ўласнасці жылля ці не могуць ўсяліцца ў жылое памяшканне, з якога яны некалі выбылі.

— Апроч агульных нормаў, кожнае прадпрыемства ці арганізацыя мае права практыкаваць і свае падыходы, — працягвае Васіль Корсук. — Да прыкладу, у калектыўным дагаворы можна вызначыць патрэбу ў залежнасці і ад іншай забяспечанасці квадратнымі метрамі. Аднак мінімальная «планка» такой патрэбы зноў-такі не павінна складаць менш за 15, а максімальная — больш за 20 «квадратаў». Праўда, трэба мець на ўвазе, што ў выпадку забяспечанасці жылплошчай у такім інтэрвале можна разлічваць на фінансавую падтрымку ў будаўніцтве толькі з боку наймальніка. Тады права на дапамогу з боку дзяржавы тут ужо не будзе.

### Прапіска — не падстава для адмовы

Адно з «папулярных» пытанняў: ці могуць паставіць на ўлік па месцы працы паўторна? Да прыкладу, у выпадку змянення складу сям'і.

— Калі змяніўся склад сям'і, і на кожнага яе члена ўжо не хапае тых жа 15 «квадратаў» агульнай плошчы, паставіць на ўлік на паляпшэнне жыллёвых умоў не толькі могуць, але і абавязаны, — адзначае Васіль Корсук. — Прычым паставіць незалежна ад таго, атрымліваў такі чалавек кватэру раней ці не.

І яшчэ адна няпростая тэма. Не сакрэт, што ў той жа сталіцы працуе значная колькасць жыхароў навакольных раёнаў. Ці мае права наймальнік ставіць на ўлік такіх грамадзян?

— Згодна з нашым заканадаўствам, зараз ёсць магчымасць прымаць работнікаў на ўлік па месцы знаходжання арганізацыі незалежна ад прапіскі, — тлумачыць Васіль Корсук. — Пры гэтым ранейшая норма, якая вызначала адной з умоў пастаноўкі на ўлік у арганізацыі пэўны час работы ў ёй, ужо не дзейнічае.

### Галоўнае — падаць заяву

Пакет дакументаў, неабходны для пастаноўкі на ўлік па месцы работы, такі ж, як і для пастаноўкі па месцы жыхарства. У прыватнасці, у гэты пакет уваходзіць даведка з бюро па рэгістрацыі і тэхнічнай інвентарызацыі, даведка аб складзе сям'і. Апроч таго, у пэўных сітуацыях могуць спатрэбіцца, да прыкладу, рашэнне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа аб прызнанні цяперашняга жылога памяшкання работніка неадпаведным санітарным і тэхнічным патрабаванням, медыцынскае заключэнне дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя аб наяўнасці захворванняў, пры якіх немагчыма сумеснае пражыванне ў адным пакоі ці кватэры, і г.д. І яшчэ. Калі гаворка ідзе аб сацыяльным жыллі, давядзецца прадставіць даведку аб даходах. А ў выпадку, калі работнік мае пэўныя льготы, трэба даць дакументы, якія гэтыя льготы пацвярджаюць.

— Разам з тым з 8 красавіка мінулага года змяніўся сам парадак уліку дакументаў, — зазначае Васіль Корсук. — Раней адначасова з падачай заявы ўсе патрэбныя даведкі павінен быў прадставіць сам грамадзянін. Зараз жа, згодна з прынцыпам «аднаго акна», непасрэдна работнік піша толькі заяву. Тады як запыт на дакументы з БРТІ, ЗАГСа, даведку з месца жыхарства абавязаны зрабіць з месца работы. І прычым — на працягу 3 дзён з даты падачы заявы.

У сваю чаргу на падрыхтоўку дакументаў установам, куды робіцца запыт, адводзіцца 10 дзён. Пасля даведкі накіроўваюцца на месца работы заяўніка. З прыкладаннем квітанцый аб аплаце — калі, вядома, тая ці іншая даведка з'яўляецца платнай і падлягае аплаце самім грамадзянінам. Зрэшты, тут жа трэба зрабіць вельмі істотную агаворку — сабраць дакументы можа і сам работнік. Прынамсі, такое права ў яго застаецца.

Важнае новаўвядзенне датычыцца таксама парадку «абнаўлення» дакументаў. Раней грамадзянін павінен быў рабіць гэта кожны год. Зараз жа штогадовыя пацвярджэнні патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў не прадугледжаны. Заканадаўства вызначае, што абнаўленне (за выключэннем выпадку, калі чалавек прэтэндуе на сацыяльнае жыллё) патрабуецца адзін раз у пяць гадоў. І здзяйсняць яго можа той жа наймальнік.

Дарэчы, цікавы нюанс. Паводле слоў Васіля Корсука, улік работнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у кожнай арганізацыі павінна весці адказная асоба, якая прызначаецца спецыяльным загадам кіраўніка. Прычым такой асобай не можа быць старшыня прафкама. Бо ёсць канкрэтнае патрабаванне заканадаўства — кантроль за вядзеннем уліку на прадпрыемстве здзяйсняецца прафсаюзным камітэтам. А кантраляваць «саміх сябе» прафкам ці яго старшыня, зразумела, не могуць.

— Пасля збору ўсіх дакументаў рашэнне аб прыняцці работніка на ўлік прымаецца на сумесным пасяджэнні адміністрацыі прадпрыемства і прафкама, — працягвае Васіль Корсук. — Такім чынам, складаецца ўліковая справа, у якой, апроч усяго, павінна быць выпіска з пратакола сумеснага пасяджэння і копія паведамлення аб прыняцці на ўлік, якая накіроўваецца работніку на працягу 10 дзён. А далей уліковыя справы перадаюцца адказнай асобе, задача якой — праводзіць штогадовыя зверкі патрэбы і фарміраваць спісы. Прычым для кантролю за правільнасцю размеркавання жылля экзэмпляр гэтых спісаў можа перадавацца ў выканкам.

### Пенсіянеры застаюцца ў спісах

Асноўная падстава для выключэння з чаргі — зразумела, «самастойнае» вырашэнне кватэрнага пытання непасрэдна работнікам. Або змяненне колькасці членаў яго сям'і. Да таго ж са спісаў будуць выключаны асобы, якія вырашаюць змяніць месца працы. Застацца ў чарзе тут можна толькі пры адной умове — звальненне ў выніку скарачэння. І тое толькі да таго моманту, пакуль скарочаны работнік не здолее ўладкавацца зноў.

Асобны выпадак — выхад на пенсію. Як падкрэслівае Васіль Корсук, выкрэсліваць са спісаў грамадзян на гэтай падставе нельга. Чарга захоўваецца нават у выпадку, калі пенсіянер знайшоў сабе новае месца ў іншай арганізацыі.

— Аднак пры гэтым ёсць правіла — чалавек, які ўжо знаходзіцца на пенсіі, на ўлік на паляпшэнне жыллёвых умоў па месцы працы прыняты быць не можа, — зазначае Васіль Корсук. — І выключэнне з падобнага правіла магчыма толькі ў адным выпадку — прадастаўлення дадатковых гарантый пенсіянерам непасрэдна ў калектыўным дагаворы арганізацыі.

### Шанц дае калдагавор

Зноў-такі варта паўтарыцца: чалавек, які стаіць на ўліку па месцы работы на падставе нормаў агульнага заканадаўства, можа разлічваць на дзяржаўную падтрымку. І ў тым ліку — на льготны крэдыт і аднаразовую субсідыю. Між тым, якую дапамогу ў будаўніцтве акажа непасрэдна арганізацыя?

— Абавязковага патрабавання да наймальнікаў аказваць фінансавую падтрымку работнікам у паляпшэнні жыллёвых умоў няма, — зазначае Васіль Корсук. — У той жа час ёсць магчымасць вызначыць такую падтрымку ў рамках калектыўнага дагавора. Прычым якіх-небудзь абмежаванняў тут не існуе. Па сутнасці, памер дапамогі будзе залежыць толькі ад аднаго — фінансавых магчымасцяў канкрэтнай арганізацыі.

**Сяргей ГРЫБ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## МІНСК У ПОШУКАХ... БУДАЎНІКОЎ

**У сталіцы назіраецца востры дэфіцыт рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў — аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Мінскім гарадскім цэнтры занятасці насельніцтва.**

Паводле звестак на пачатак студзеня, у цэлым па гораду налічвалася 13 397 рабочых вакансій, прычым прыкладна чацвёртая частка з іх была менавіта прадстаўнікоў будаўнічых спецыяльнасцяў. Да прыкладу, зараз арганізацыям горада патрабуецца адразу 569 муляраў, 154 маляры, 134 маляры-тынкоўшчкі, 111 плітачнікаў-абліцоўшчыкаў, 98 бетоншчыкаў, 61 цясляр. Да таго ж чакаецца, што бліжэй да «актыўнага сезона» будаўнічых работ падобныя лічбы будуць узрастаць.

У сувязі з гэтым, адзначаюць у цэнтры, многія арганізацыі сталіцы гатовыя прапанаваць працоўныя месцы жыхарам іншых, і не толькі прылеглых да Мінска, раёнаў. А ў асобных выпадках — нават з прадастаўленнем месца ў інтэрнаце. Праўда, гаворка ідзе выключна аб прадстаўніках будаўнічых спецыяльнасцяў, якія валодаюць адпаведнай кваліфікацыяй. І, апроч таго, перавага ў працаўладкаванні іншагародніх рабочых-будаўнікоў з прадастаўленнем жылля аддаецца грамадзянам нашай краіны без сем'яў.

Між тым, зазначылі ў цэнтры занятасці, не менш значныя праблемы з запаўненнем вакансій узнікаюць і па некаторых іншых прафесіях. Апроч будаўнікоў, зараз у наймальнікаў сталіцы існуе вялікі попыт на вадзіцеляў аўтамабіляў, аўтобусаў і тралейбусаў, а таксама на гандляроў і касіраў.

**Сяргей ГРЫБ.**

# СТРУКТУРНАЯ ПЕРАБУДОВА КРЫМІНАЛУ

## У Беларусі назіраецца тэндэнцыя росту злачынстваў, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі

**Учора адбылася прэс-канферэнцыя міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра Навумава.**

Генерал Навумаў адзначыў, што летась у нашай краіне значна змянілася структура злачыннасці: зменшылася колькасць цяжкіх парушэнняў закона і адбыўся рост злачынстваў, якія не ўяляюць вялікай грамадскай небяспекі. Паводле слоў кіраўніка МУС, напрыклад, у выніку прынятых дзяржавай мераў у сферы барацьбы з гандлем людзьмі, колькасць згвалтаванняў зменшылася да ўзроўню 60-х гадоў, калі «мараль у грамадстве была крыху вышэйшай». Затое «прагрэсуюць» сучасныя віды злачыннасці. У прыватнасці, як адзначыў міністр, за апошнія 3 гады ў дзесяткі разоў вырасла статыстыка крадзяжоў мабільных тэлефонаў. Увогуле летась было зарэгістравана 191,5 тысячы злачынстваў, з якіх каля 70 працэнтаў звязаны з замахам на ўласнасць. Адметна, што палову ўсіх злачынстваў здзяйсняюць асобы, якія раней мелі непрыемнасці з законам. Кожны трэці парушальнік знаходзіўся ў нецвярозым стане. На рахунку непаўналетніх прыкладна 13 працэнтаў злачынстваў. Кіраўнік МУС падкрэсліў, што падлеткавая злачыннасць скарачаецца. Пра гэта яскрава сведчыць той факт, што 2 гады таму была зачынена дзіцячая калонія. Зараз абмяркоўваецца магчымасць ліквідацыі яшчэ адной такой папраўчай установы. Калі гэта адбудзецца, то ў Беларусі застанецца толькі адна калонія для непаўналетніх, разлічаная на 500—700 дзяцей.

Міністр таксама пракаментаваў некаторыя «гучныя» справы. У прыватнасці, генерал Навумаў патлумачыў, чаму сталічныя барацьбіты з эканамічнай злачыннасцю затрымалі толькі пасрэднікаў, якія вымагалі ў дырэктара адной сталічнай арганізацыі хабар у памеры 7 мільёнаў долараў.

Нагадаю, што гэтая «хабарная гісторыя» адбылася ў сакавіку мінулага года. Службовыя асобы шэрагу буйных прадпрыемстваў сталіцы вымагалі ў кіраўніка будаўнічай фірмы 7 мільёнаў долараў. Гэтыя грошы, паводле слоў «падбухторшчыкаў», прызначаліся нібыта кіраўнікам Мінскага райвыканкама, якія павінны былі станоўча вырашыць пытанне аб выдзяленні забудоўшчыку 20 гектараў зямлі пад катэджы паблізу населенага пункта Капішча. У момант, калі пасрэднікі атрымлівалі першую «траншу» хабару ў памеры 1,5 мільёна долараў, іх і арыштавалі супрацоўнікі міліцыі. Уладзімір Навумаў патлумачыў, што злачынцы маглі знікнуць з грашыма. Таму міліцыянеры не сталі чакаць, што будуць рабіць пасрэднікі далей, панясуць яны хабар чыноўнікам ці не стануць ні з кім дзяліцца такой вялікай здабычай. Апошняя версія выглядае найбольш праўдападобна. Зрэшты, усе кропкі над «і» ў гэтай «гучнай» справе павінен паставіць суд.

Не завяршыўся таксама і працэс па яшчэ адной «гучнай» справе. У ёй фігуруюць колішнія кіраўнікі некаторых мадэльных агенцтваў, якія займаліся вывазам беларускіх дзяўчат за мяжу з мэтай сексуальнай эксплуатацыі. Па інфармацыі міністра, на лаве падсудных апынуліся больш за 10 гандляроў «жывым таварам», ахвярамі якіх сталі каля 800 нашых суайчынніц. Суд праходзіць за зачыненымі дзвярыма.

Увогуле, паводле слоў міністра, асноўным крытэрыем эфектыўнасці працы міліцэйскіх падраздзяленняў з'яўляюцца не толькі і не столькі лічбавыя паказчыкі, а найперш меркаванні людзей. Дык вось. Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, апошнім часам павысіўся аўтарытэт вартавых правапарадку ў грамадстве. Напрыклад, з усіх органаў дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацый трэць рэспандэнтаў выказала давер найперш міліцыі свайго горада ці раёна.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ПРАПІСНАЯ ЭПАПЕЯ НАБЛІЖАЕЦЦА ДА ЗАВЯРШЭННЯ

**У бліжэйшыя 2 гады будзе ліквідаваны адзін з самых жывучых перажыткаў савецкага мінулага — інстытут прапіскі.**

Такую інфармацыю паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі **міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір НАВУМАЎ**. Паводле яго слоў, адпаведны заканадаўчы акт будзе разгледжаны ўжо ў лютым. Паводле гэтага дакумента замест прапіскі плануецца ўкараніць сістэму рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства. Кіраўнік МУС падкрэсліў, што ініцыятарам адмены прапіскі былі не праваахоўныя органы, а ЖЭСы і іншыя ўстановы, якія зацікаўлены ў дакладным уліку пражывання людзей.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

БЕЛПРОМСТРОЙБАНК
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

ОАО «Белпромстройбанк» устанавливает с 25 января 2007 г. следующие условия выпуска сберегательных сертификатов физических лиц в белорусских рублях:

| Срок обращения | Процентная ставка (годовых) | Номинальная стоимость (рублей) | Периодичность выплаты процентов |
|---|---|---|---|
| 3 месяца | 12 | от 200 000 | Одновременно с погашением сберегательного сертификата |

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «Белпромстройбанк» или по телефону в г. Минске 289-46-06.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 27.10.2006 года на осуществление банковской деятельности.

Возврат средств физических лиц в ОАО «Белпромстройбанк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

БЕЛАРУСБАНК

Сделайте себе и близким подарок!

АСБ «Беларусбанк» информирует, что с 26 января по 7 марта 2007 года включительно принимает денежные средства населения на новый срочный банковский вклад в белорусских рублях

«ПАДАРУНАК».

Срок хранения вклада — 3 месяца.
Фиксированная ставка — 12 % годовых.
Минимальная сумма для открытия вклада — не ограничена.

**Особые условия вклада «Падарунак»:**
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Неизменная процентная ставка до конца срока вклада.
- Без права пополнения вклада.
- Ежемесячная капитализация дохода и его выплата.

АСБ «Беларусбанк» также с 26 января по 7 марта 2007 года включительно осуществляет прием денежных средств населения на новый срочный банковский вклад для физических лиц в иностранной валюте

«ПРАЗДНИЧНЫЙ».

Срок хранения вклада — 2 месяца.
Фиксированная ставка — 7 % годовых.
Минимальная сумма для открытия вклада — не ограничена.
Валюта вклада — доллары США или евро.

**Особые условия вклада «Праздничный»:**
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Неизменная процентная ставка до конца срока вклада.
- Без права пополнения вклада.
- Ежемесячная капитализация дохода и его выплата.

Обращаем Ваше внимание, что выгодным размещением денежных средств может быть приобретение

СБЕРЕГАТЕЛЬНЫХ СЕРТИФИКАТОВ.

С 26 января по 7 марта 2007 года включительно АСБ «Беларусбанк» **повысил процентные ставки по сберегательным сертификатам АСБ «Беларусбанк» с 10 % до 12 %** годовых.

Процентная ставка в период срока обращения сертификата не изменяется.

Время обращения сертификата 3 месяца.

Сберегательные сертификаты банка выпускаются в белорусских рублях и являются именными.

Погашение сертификатов осуществляется в любом отделении банка, независимо от места их приобретения.

Также предлагаем воспользоваться другими услугами, имеющимися в банке.

Будем рады видеть Вас клиентами АСБ «Беларусбанк».

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка

http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 140,00 |
| 1 еўра | 2 784,57 |
| 1 латвійскі лат | 3 992,16 |
| 1 літоўскі літ | 806,45 |
| 1 чэшская крона | 99,30 |
| 1 польскі злоты | 717,29 |
| 1 расійскі рубель | 80,79 |
| 1 украінская грыўня | 422,80 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,4879 |
| 10 UAH | 52,3600 |
| 1000 BYR | 12,3591 |
| EUR | 34,4555 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.01.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2325 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

